

# Рыгор ШАУРА: педагог, мастак, навуковец

**Нядаўна лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», кавалер медаля Францыска Скарыны, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Рыгор Фёдаравіч Шаура, загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, адзначыў 80-годдзе**

Галіна Баравіцкая
Фота Уладзіміра Блінова
і з архіва Рыгора Шауры

З гэтай нагоды ў сталічнай мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» працуе выстава яго твораў. Яна складаецца з 60 прац: серыі лінагравюр, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, серыі акварэльных пейзажаў, прысвечаных малой радзіме, а таксама нацюрмортаў і партрэтаў.

Нарадзіўся Рыгор Фёдаравіч 30 жніўня 1944 года ў сям'і ўдзельніка Першай сусветнай вайны Фёдара Афанасьевіча і Фёклы Іванаўны ў вёсцы Малы Поўсвіж Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Месца маляўнічае, побач — два возеры, Поўсвіжскае і Доўгае. Пазней гэтыя любыя сэрцу краявіды не раз будуць натхняць мастака на стварэнне пейзажаў. Наогул тэма малой радзімы ў творчасці мастака з'яўляецца адной з галоўных. Кожны год ён імкнецца наведаць родную вёску. Таму невыпадкова юбілейная выстава мае такую назву — «Мой родны кут». Адразу ў памяці пачынаюць гучаць радкі з паэмы «Новая зямля» класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!*

Любоў да роднай зямлі, імкненне захаваць яе спадчыну і вызначылі жыццёвы шлях Рыгора Шауры.

Першую адукацыю атрымаў у сямігодцы. Школа знаходзілася на супрацьлеглым баку возера, ісці трэба было каля 1,5 кіламетра, дарога вяла праз кладку. Вясной ручаіна, якая злучалася з возерам, выходзіла з берагоў, і тады ў дзяцей пачыналіся доўгія канікулы. Падчас вучобы ў школе займаўся ў фотагуртку, любіў наведваць кінасеансы. На ўсё жыццё засталіся цёплыя ўспаміны пра педагогаў школы: настаўніка нямецкай мовы Канстанціна Іванавіча Ганчара, настаўніка спеваў і фізкультуры Леаніда Кірылавіча Карабаня...

Як і ўсе вясковыя дзеці, шмат працаваў: дапамагаў нарыхтоўваць дровы, выбіраць бульбу, малоць зерне, пасвіць жывёлу. Усе вольныя хвіліны аддаваў маляванню. На простай паперы звычайным алоўкам і фарбамі занатоўваў усё, што цешыла вока. Пасля заканчэння сямігодкі прадоўжыў вучобу ў лепельскай сярэдняй школе № 2. Дабірацца трэба было пешшу каля трох з паловай кіламетраў. Урокі пачыналіся рана, і таму трэба было выпраўляцца ў дарогу яшчэ на досвітку, а часта і аднаму. Зімой, калі выпадала шмат снегу, даводзілася «прабіваць» дарогу па цаліне... Але ўсе гэтыя складанасці толькі загартоўвалі характар, прывучалі не баяцца перашкод, а пераадольваць іх. Хутка праляцелі гады вучобы ў дзесяцігодцы, і надышоў час вызначыцца, што рабіць далей. Але спачатку трэба было аддаць канстытуцыйны доўг Радзіме. Так распарадзіўся лёс, што Рыгора Шауру накіравалі ў 2-ю асобную армію супрацьпаветранай абароны. У войску спатрэбіліся прыродныя здольнасці юнака — служыў планшэцістам пры батарэі кіравання і мастаком пры штабе воінскай часці.







На другім годзе службы Рыгор пазнаёміўся з выпускніком Талінскага мастацкага інстытута Генадзіўсам Іавайшам. Гэта сустрэча і сяброўства паўплывалі на выбар далейшага лёсу: з'явілася мара паступіць на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. І мара здзейснілася. Вучыцца было вельмі цікава, а імкненне да самаўдасканалення штурхала займацца дадаткова ў творчых гуртках, выходзіць на пленэры. Асаблівую цікавасць выклікала лінагравюра. Факультатыў па графіцы вёў Рыгор Піліпавіч Клікушын, і яго апантанасць перадалася студэнтам. Хлопцы старанна бясконца рэзалі лінолеум, каб навучыцца ствараць кампазіцыі. Незаўважна настаў час задумацца над тэмай дыпломнай працы. І ёй стала серыя лінагравюр на тэму Вялікай Айчыннай вайны. Як аднаму з найлепш падрыхтаваных і перспектыўных студэнтаў Рыгору Шауру прапанавалі застацца ў якасці выкладчыка на кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва інстытута. Праз некаторы час яму прапанавалі паступіць у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. Ён згадзіўся. Так пачаўся новы этап у жыцці маладога выкладчыка. Даводзілася шмат працаваць у бібліятэках Мінска і Масквы, і вясковая загартоўка дапамагала спраўляцца з нагрузкамі.

У 1977 годзе Рыгора Шауру запрасілі на працу ў тагачасны Мінскі інстытут культуры ў якасці выкладчыка. І вось ужо 47 гадоў шчыруе на ніве адукацыі і навукі Рыгор Фёдаравіч Шаура. За гэты час было зроблена шмат. У 1983 годзе абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму самадзейнага выяўленчага мастацтва Беларусі. Тэма абрана новая, і таму патрэбна было сабраць шмат фактычнага матэрыялу. А гэта бясконцыя кіламетры дарог і сустрэчы, сустрэчы, сустрэчы... Дзякуючы гэтай працы пра многіх выдатных самабытных майстроў стала вядома шырокай публіцы. Забягаючы наперад, скажам, што матэрыялу было сабрана столькі, што ў 1995 годзе была падрыхтавана па гэтай тэме манаграфія.




Знаёмства з самабытнымі ўмельцамі прыводзіла да разумення, што народныя рамёствы — гэта сапраўдны скарб і трэба абавязкова захаваць

яго для нашчадкаў. Так нарадзілася ідэя стварыць асобную кафедру — народных рамёстваў і навучаць гэтаму студэнтаў. І яна спраўдзілася ў 1993 годзе. Узначаліў яе Рыгор Фёдаравіч Шаура. Набылі неабходнае абсталяванне, адпаведную сыравіну — гліну, салому, ніткі, фарбы... Мінула больш за 30 гадоў, і бачны плён працы кафедры: сфарміраваліся школы ганчарства, керамікі, традыцыйнага і сучаснага ткацтва, пляцення з прыродных матэрыялаў, дэкаратыўнага роспісу, габелена... Студэнты прымаюць удзел у міжнародных конкурсах, фестывалях, прэзентуючы там дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі, атрымліваюць узнагароды. Наладжаны трывалыя сувязі з рознымі навучальнымі ўстановамі свету, праводзяцца навуковыя канферэнцыі.

6 кастрычніка 2000 года быў падпісаны дакумент, у адпаведнасці з якім мастацкая галерэя Палаца Рэспублікі стала пляцоўкай для дэманстрацыі шырокаму колу грамадскасці дасягненняў навучэнцаў кафедры. І за гэты час ужо сфарміравалася свая аўдыторыя прыхільнікаў, якія ўважліва сочаць за абвесткамі і не прапускаюць выстаў дыпломных прац студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У 2000 годзе загадчык кафедры Рыгор Фёдаравіч Шаура стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». У 2009 годзе абараніў доктарскую дысертацыю. Дзякуючы яго намаганням і ў суаўтарстве створаны навучальныя дапаможнікі для студэнтаў, рэгулярна з'яўляюцца навуковыя артыкулы. На дадзены момант іх больш за 150 (і гэта не апошняя лічба), з іх 12 манаграфій і навучальных дапаможнікаў.






Чалавека можна назваць шчаслівым, калі ён займаецца любімай справай. Гэта меркаванне цалкам спраўджваецца на прыкладзе асобы Рыгора Фёдаравіча. Ён і не збіраецца на адпачынак: ёсць шмат задумак, ідэй, якія хочацца ажыццявіць. Нястомны працаўнік, ён самаддана працуе з моладдзю, мякка, па-бацькоўску далікатна накіроўвае яе на правільную дарогу, шчодра дзеліцца вопытам. Самае цікавае, што пры такой загружанасці — а пасада загадчыка кафедры вымагае займацца і рознымі адміністрацыйнымі справамі — ён яшчэ знаходзіць час для творчасці. Любіць майстраваць.

Некалькі соцень прац створана рукой майстра. Большую частку з іх складаюць акварэлі. Акварэль — вельмі капрызная тэхніка. Адзін няправільны рух — і праца сапсавана. А для Рыгора Фёдаравіча — любімая, менавіта дзякуючы сваёй непрадказальнасці. Яго творы знаходзяцца ў прыватных калекцыях, у краязнаўчых музеях, у фондзе Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Рыгор Фёдаравіч — член Беларускага саюза мастакоў.

Праз дзесяцігоддзі ён зноў звярнуўся да тэмы, якая незагойнай ранай засталася на сэрцы, — тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Ён нарадзіўся на мірнай зямлі, кананады грымелі ўжо далёка на захадзе, але ён бачыў скалечаных ветэранаў, слухаў аповяды дарослых. Сям'я некалькі гадоў жыла пад акупацыяй. Дапамагаў партызанам у якасці сувязнога старэйшы брат Фёдар, не раз быў на валасок ад гібелі. Калі вызвалілі Беларусь, яго мабілізавалі ў войска. Перад адпраўкай на фронт ён забег пабачыцца з роднымі і на развітанне сказаў: «Чакайце мяне з Перамогай...». Але дамоў Фёдар Шаура не вярнуўся — 6 красавіка 1945 года атрымаў цяжкае раненне пры штурме Кёнігсберга і 9 красавіка адышоў у іншы свет... Фёкла Іванаўна аплаквала сына да канца свайго жыцця. Толькі праз 60 гадоў сям'я даведалася, дзе пахаваны Фёдар Фёдаравіч Шаура. Пад сялом Пераяслаўскае Калінінградскай вобласці знаходзіцца мемарыяльны комплекс, і сярод соцень пералічаных імёнаў загінулых значыцца імя Фёдара Шауры...











Прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне і дзядзька мастака — Якаў Афанасьевіч Шаура. На пачатку вайны ён трапіў у палон. Абяззброеных чырвонаармейцаў размясцілі пад адкрытым небам на пляцоўцы пад Лепелем, абнеслі іх калючым дротам і трымалі без ежы і вады. Дзядзьку выратаваў цуд — жанчына з суседняй вёскі пазнала ў схуднелым змарнелым чалавеку Якава Шауру і паведаміла сваякам. Цётка Шура адважылася на адчайны крок, каб выратаваць свайго мужа: падрыхтавала торбу ежы — сала, яйкі, хлеб, сабрала дзяцей і пайшла да ахоўнікаў прасіць адпусціць дамоў палоннага. І цуд — яго адпусцілі. Дзядзьку Якава пад рукі ледзь прывялі дамоў, кармілі з лыжкі, але выхадзілі. У 1944-м ён быў мабілізаваны, дайшоў да Берліна, вярнуўся дамоў з узнагародамі.

А ўвогуле не вярнуліся з вайны 170 жыхароў вёскі Малы Поўсвіж і суседніх паселішчаў.

Некалькі год таму Рыгор Фёдаравіч аднавіў серыю лінагравюр, якая была створана ў 1970-я гады: «У засценках», «Вайна ў вачах дзяцей», «Партызаны», «У наступленне», «Пад Сталінградам», «Пераможца». У хуткім часе яна будзе перададзена ў дар Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны як даніна памяці сваякам і землякам, якія загінулі на вайне.

Падрыхтаваны таксама альбом, які расказвае пра самадзейнае мастацтва партызан.

Маштаб асобы Рыгора Фёдаравіча ўражвае: столькі карыснага зроблена на ніве культуры! Зярняты, пасеяныя выдатным педагогам, даюць добры плён: у розных кутočках краіны раз'язджаюцца яго вучні, каб працягваць справу свайго настаўніка — зберагаць спадчыну, павялічваць культурныя здабыткі, выхоўваць маладое пакаленне... Нізкі вам паклон, Рыгор Фёдаравіч, і творчага даўгалецця!

